ГАЗЕТА ГОМЕЛЬСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ ФРАНЦЫСКА СКАРЫНЫ

# Гомельскі ўніверсітэт



№ 7 (889) | Аўторак, 18 красавіка 1995г. | Газета заснавана ў верасні 1969 года | Выходзіць два разы ў месяц | Цана дагаворная

## ВІНШАВАЎ СТАРШЫНЯ АБЛВЫКАНКОМА

5-га красавіка адбылося незвычайнае пашыранае пасяджэнне Савета універсітэта з удзелам старшыні абласнога выканкома П.У.Шыпуком. Яно было даволі кароткім. Выступіў кіраўнік абласной выканаўчай улады. Павел Уладзіміравіч адзначыў, што сёлета вядучай вышэйшай навучальнай ўстанове Беларускага Палесся спаўняецца 65 гадоў. Напачатку гэта быў аграпедагагічны інстытут, затым -- педагагічны інстытут імя В.П.Чкалава і вось ужо больш чвэрці стагоддзя - дзяржаўны універсітэт, які цяпер носіць імя беларускага першадрукара, выдатнага вучонага і асветніка Францыска Скарыны.За час свайго існавання універсітэт дасягнуў прыкметных вынікаў і стала заканамерным, што за значны ўклад у развіццё беларускай навукі Указам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь А.Р.Лукашэнкі ад 13 лютага 1995 г. рэктару ГДУ члену-карэспандэнту АНБ прафесару Л.А.Шамяткову прысвоена ганаровае званне "Заслужаны дзеяч навукі Рэспублікі Беларусь". З гэтай нагоды П.У.Шыпук горача павіншаваў Леаніда Аляксандравіча і ўручыў яму адпаведныя пасведчанне і знак.

У адказным слове Л.А.Шамяткоў сказаў, што прысвоенае яму званне -- гэта набытак усяго універсітэта. Ён адзначыў, што для развіцця універсітэта вялікі ўклад унеслі яго папярэднія рэктары акадэмікі У.А.Белы і Б.В.Бокуць, і ён пастараецца дастойна працягваць іх справу.

## ДЛЯ ЎЛАСНЫХ ПАТРЭБ

Далёка не многія сем'і могуць цяпер пражыць на голую зарплату ці пенсію. Каб неяк зводзіць канцы з канцамі, усё больш і больш людзей імкнецца атрымаць зямельны надзел. На ўчастку хоць і шмат папрацаваць даводзіцца, але ж пэўная выгада ёсць. Яна як у матэрыяльным сэнсе, так і ў фізічнай загартоўцы. Таму вельмі добрую справу робяць адміністрацыя і прафком універсітэта, якія выкарыстоўваюць усе магчымасці для больш поўнага задавальнення патрэб у дачных і садова-агародных участках. Вось і на мінулым тыдні створаны яшчэ адзін кааператыў. У яго ўвайшлі 47 выкладчыкаў, супрацоўнікаў, пенсіянераў. Для іх выдзелена па 10 сотак добра распрацаванай зямлі каля чыгуначнага прыпынку "Каравышань" на 14 км ад Гомеля.

На першым арганізацыйным сходзе перад членамі новага кааператыву, якія выбралі яго праўленне, выступілі першы прарэктар універсітэта М.В.Селькін і старшыня прафкома Г.І.Варатніцкі.

## ДЫСКАТЭКА "ЛАЙТ" -- ДЛЯ СТУДЭНТАЎ

У лютым бягучага года прафком студэнтаў універсітэта заключыў дагавор з Прыватным фондам падтрымкі і развіцця культуры /заснавальнік С.Ярмак/, згодна якому студэнты універсітэта, якія жывуць у інтэрнатах, могуць бясплатна наведваць дыскатэку "Лайт" па аўторках і чацвяргах кожны тыдзень да 22 мая.

Запрашальныя білеты распаўсюджвае прафком студэнтаў кожную сераду і чацвер з 14 да 16 гадзін.

### *За ажыццяўленне Сорасаўскіх праграм*

## УКЛЮЧАЙЦЕСЯ Ў САПЕРНІЦТВА

Кароткая інфармацыя аб Савеце універсітэта, які адбыўся 30 сакавіка, была змешчана ў папярэднім нумары нашай газеты. Аднак парадак яго дня быў значна шырэйшы, чым указана ў публікацыі. На Савеце, у прыватнасці, выступіў рэктар член-карэспандэнт АН Беларусі Л.А.Шамяткоў. Ён гаварыў аб важнасці ўдзелу ў распрацоўках Сорасаўскіх праграм. Аб адной з іх -- па адукацыі -- мы змясцілі падрабязны матэрыял у газеце за 4 красавіка. Нядаўна ў Беларусі аб'яўлена і Міжнародная Сорасаўская праграма ў галіне дакладных навук.

У нашай рэспубліцы заслужанымі Сорасаўскімі прафесарамі сталі шырока вядомыя вучоныя М.А.Барысевіч, М.А.Ельяшэвіч, Г.І.Новікаў, А.М.Палілова, Р.Л.Старобінец, Сорасаўскімі прафесарамі -- П.І.Лабко з Мінскага медыцынскага інстытута, І.К.Лапацін, Ю.К.Фамічоў, Р.І.Тышкевіч, В.В.Свірыдаў з Белдзяржуніверсітэта, А.А.Чыркін з Віцебскага медыцынскага інстытута, В.І.Баштавой, В.П.Шульман з Беларускай дзяржаўнай політэхнічнай акадэміі, В.Е.Барысенка з Беларускага дзяржаўнага універсітэта інфарматыкі і радыётэхнікі, А.С.Рубанаў з Інстытута фізікі АНБ, А.К.Баеў з тэхналагічнага універсітэта.

Ужо ёсць пэўныя набыткі і вучоных нашага універсітэта. Індывідуальныя гранты Сораса атрымалі дэкан фізічнага факультэта І.В.Семчанка, загадчык кафедры алгебры і геаметрыі В.С.Манахаў, дацэнт гэтай жа кафедры С.Ф.Каморнікаў, загадчык кафедры агульнай фізікі Д.Р.Лін, дацэнт кафедры псіхалогіі і падрыхтоўкі да паступлення ў ВНУ І.М.Елісеева, кіраўнік лабараторыі фотаакустычнай спектраскапіі Г.С.Міцюрыч, В.П.Зялёны і І.М.Ахраменка з кафедры оптыкі.

Грант для ўдзелу ў Міжнароднай канферэнцыі ў Ізраіле атрымаў А.Р.Міроцін з кафедры вышэйшай матэматыкі.

Аспірантка кафедры алгебры і геаметрыі Л.П.Аўдашкова /навуковы кіраўнік -- прафесар Л.А.Шамяткоў/ удастоена Сорасаўскай стыпендыі.

На пасяджэнні Савета Л.А.Шамяткоў заклікаў вучоных, выкладчыкаў, супрацоўнікаў, аспірантаў і студэнтаў нашага універсітэта больш актыўна ўдзельнічаць у ажыццяўленні Сорасаўскіх праграм, аб'яўленых у Беларусі, і настойліва сапернічаць за атрыманне ганаровых званняў, грантаў і стыпендый. За растлумачэннем усіх цікавячых пытанняў неабходна звяртацца ў навуковы аддзел універсітэта, а таксама па адрасу:

220072 г.Мінск, пр-т Ф.Скарыны, 66, Міжнародная Сорасаўская праграма, т. 39-57-45.

## З УЗНАГАРОДАЙ!

***За шматгадовую навуковую і вучэбную работу па падрыхтоўцы маладых спецыялістаў і актыўны ўдзел у грамадскім жыцці дацэнт кафедры эканамічнай інфарматыкі і АСК КОТАЎ Геній Клаўдзіевіч узнагароджаны Ганаровай граматай універсітэта.***

## 14 МАЯ -- ВЫБАРЫ Ў ВЯРХОЎНЫ САВЕТ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

***29 сакавіка на канферэнцыі працоўнага калектыву Гомельскага дзяржаўнага універсітэта імя Ф.Скарыны яго прарэктар па вучэбнай рабоце кандыдат філалагічных навук, дацэнт М.М.Воінаў быў вылучаны, а ў красавіку зарэгістраваны акруговай выбарчай камісіяй кандыдатам у дэпутаты Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь па Гомельскай-Цэнтральнай выбарчай акрузе № 86.***

# НА ЯГО ДЗЕЙНАСЦЬ -- НАШЫ СПАДЗЯВАННІ



М.М.Воінаў нарадзіўся ў 1943 г. у пасёлку Станкі Веткаўскага раёна. Беларус.

Усё жыццё Мікалая Мікалаевіча звязана з установамі адукацыі. Закончыўшы ў 1965 годзе Гомельскі педагагічны інстытут імя В.П.Чкалава, працаваў настаўнікам Хутарскай сярэдняй школы Светлагорскага раёна, служыў у радах Савецкай Арміі. Па заканчэнні аспірантуры працаваў у Гомельскім дзяржаўным універсітэце, дырэктарам Гомельскага прафесійна-тэхнічнага вучылішча №126 народных мастацкіх промыслаў, дырэктарам Гомельскага педагагічнага вучылішча. Выдатнік прафтэхадукацыі Беларусі, дэлегат VII Рэспубліканскага з'езда настаўнікаў, Усесаюзнага з'езда работнікаў народнай адукацыі.

Са жніўня 1990 г. М.М.Воінаў -- прарэктар па вучэбнай рабоце Гомельскага дзяржаўнага універсітэта імя Ф.Скарыны. Карыстаецца аўтарытэтам у выкладчыкаў, супрацоўнікаў і студэнтаў.

М.М.Воінаў мае значны вопыт арганізатарскай і дэпутацкай дзейнасці: выбіраўся дэпутатам раённага, гарадскога і абласнога Саветаў. Галоўным дэпутацкім абавязкам лічыць аператыўнае выкананне наказаў выбаршчыкаў, паляпшэнне абслугоўвання насельніцтва ва ўсіх сферах яго жыццядзейнасці, забеспячэнне людзей якаснымі прадуктамі харчавання ў адпаведнасці з медыцынскімі нормамі.

Калі выбаршчыкі зноў акажуць Мікалаю Мікалаевічу давер'е і ён увойдзе ў вышэйшы заканадаўчы орган Рэспублікі Беларусь, свае высокапрафесійныя веды і энергічныя намаганні накіруе на вырашэнне на тэрыторыі акругі неадкладных сацыяльна-эканамічных і маральных праблем.

Сваімі першачарговымі задачамі лічыць правядзенне неабходнай работы для таго, каб у рэспубліцы забяспечыць:

-- аб'яднанне прагрэсіўных сіл для сацыяльнай абароны ўсіх колаў насельніцтва пры пераходзе да рыначных адносін;

-- зацвярджэнне законнасці, недапушчэнне парушэння правоў чалавека;

-- распрацоўку дзяржаўнай праграмы развіцця і захавання школы на аснове прынцыпаў дэмакратызму, арыентацыі на сусветны ўзровень адукацыі;

-- аднаўленне абавязковай бясплатнай сярэдняй адукацыі;

-- выкананне ўсіх артыкулаў Закона аб адукацыі Рэспублікі Беларусь;

-- штогадовае мэтавае выдзяленне асігнаванняў на развіццё і аднаўленне матэрыяльна-тэхнічнай базы навучальных устаноў;

-- устанаўленне льготнага падаткаабкладання для вышэйшых навучальных устаноў на даходы, звязаныя з навучальна-выхаваўчым працэсам і выкананнем навукова-доследных і доследна-канструктарскіх работ;

-- прадастаўленне льготных крэдытаў работнікам бюджэтнай сферы, якія маюць патрэбу ў жыллі і яго паляпшэнні;

-- стварэнне нармальных умоў студэнтам для іх вучобы і жыцця, каб выпускаць высокакваліфікаваных спецыялістаў;

-- аздараўленне дзяцей, якія жывуць на тэрыторыі акругі, у экалагічна чыстай мясцовасці;

-- рэалізацыю праграмы "Вольны час" для дзяцей і падлеткаў у мэтах барацьбы са злачыннасцю;

-- актыўны ўдзел гамяльчан ў добраўпарадкаванні свайго горада.

Чалавечая дабрыня і душэўная шчодрасць, прафесійная кампетэнтнасць і глыбокае веданне жыцця, мэтанакіраванасць і ўменне адстойваць свае прынцыпы пераконваюць, што Мікалай Мікалаевіч Воінаў будзе дастойна прадстаўляць інтарэсы сваіх выбаршчыкаў у Вярхоўным Савеце Рэспублікі Беларусь.

***Вашы галасы за М.М.Воінава -- гэта галасы за дзелавітасць, настойлівасць, глыбокую ўвагу да запатрабаванняў і клопатаў людзей.***

**ГРУПА ПАДТРЫМКІ.**



# НОВЫ САСТАЎ САВЕТА УНІВЕРСІТЭТА

У адпаведнасці з Палажэннем аб Савеце вышэйшай навучальнай установы і Статутам універсітэта загадам па ГДУ ад 27 сакавіка 1995 г. зацверджаны новы састаў Савета універсітэта:

1. Рэктар універсітэта.
2. Першы прарэктар, прарэктар па вучэбнай рабоце.
3. Прарэктар па вучэбнай рабоце.
4. Прарэктар па навуковай рабоце.
5. Прарэктар па кадрах і сацыяльна-бытавых пытаннях.
6. Прарэктар па адміністрацыйна-гаспадарчай рабоце.
7. Прадстаўнік прафкома супрацоўнікаў.
8. Прадстаўнік прафкома студэнтаў.
9. Начальнік вучэбнага аддзела.
10. Начальнік навукова-даследчага сектара.
11. Галоўны бухгалтар.
12. Дырэктар бібліятэкі.
13. Дэкан геолага-геаграфічнага факультэта.
14. Дэкан біялагічнага факультэта.
15. Дэкан гісторыка-юрыдычнага факультэта.
16. Дэкан матэматычнага факультэта.
17. Дэкан фізічнага факультэта.
18. Дэкан філалагічнага факультэта.
19. Дэкан факультэта фізічнай культуры.
20. Дэкан эканамічнага факультэта.
21. Дэкан завочнага факультэта.
22. Дэкан факультэта падрыхтоўкі да паступлення ў ВНУ і прафарыентацыі.
23. Дэкан факультэта павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі кадраў.
24. КАЛУГІН Аляксей Савельевіч -- доктар медыцынскіх навук, прафесар кафедры фізіялогіі чалавека і жывёлін.
25. ВАЛЕТАЎ Валянцін Васільевіч -- доктар біялагічных навук, прафесар кафедры батанікі і фізіялогіі раслін.
26. БОГДЭЛЬ Іван Іванавіч -- кандыдат геаграфічных навук, загадчык кафедры геаграфіі.
27. КАЛМЫКОЎ Уладзімір Мікалаевіч -- доктар філасофскіх навук, прафесар, загадчык кафедры філасофіі.
28. КАЧАТКОЎ Уладзімір Іванавіч -- кандыдат філасофскіх навук, загадчык кафедры палітычнай сацыялогіі.
29. НЯМКЕВІЧ Ігар Віктаравіч -- кандыдат гістарычных навук, дацэнт кафедры правазнаўства.
30. ЛАЗЬКО Рыгор Рыгоравіч -- кандыдат гістарычных навук, загадчык кафедры ўсеагульнай гісторыі.
31. ПАЛЯКОЎ Леў Якаўлевіч -- кандыдат фізіка-матэматычных навук, дацэнт кафедры алгебры і геаметрыі.
32. СЕМЯНЧУК Уладзімір Мікалаевіч -- кандыдат фізіка-матэматычных навук, загадчык кафедры вышэйшай матэматыкі.
33. МІРОНЕНКА Уладзімір Мікалаевіч -- кандыдат фізіка-матэматычных навук, прафесар, загадчык кафедры дыферэнцыяльных ураўненняў.
34. МАКСІМЕЙ Іван Васільевіч -- доктар тэхнічных навук, прафесар, загадчык кафедры матэматычных праблем кіравання.
35. ЛІН Дзмітрый Рыгоравіч -- доктар тэхнічных навук, прафесар, загадчык кафедры агульнай фізікі.
36. МАКСІМЕНКА Мікалай Васільевіч -- доктар фізіка-матэматычных навук, прафесар, загадчык кафедры тэарэтычнай фізікі.
37. АЛЯШКЕВІЧ Мікалай Іванавіч -- кандыдат фізіка-матэматычных навук, загадчык кафедры фізічнай метралогіі.
38. ДЗЕМІДЗЕНКА Алег Міхайлавіч -- кандыдат тэхнічных навук, загадчык кафедры АСАІ.
39. БАННІКАВА Людміла Сцяпанаўна -- кандыдат філалагічных навук, загадчыца кафедры англійскай мовы.
40. АНІЧЭНКА Уладзімір Васільевіч -- доктар філалагічных навук, прафесар кафедры беларускай мовы.
41. ШТЭЙНЕР Іван Фёдаравіч -- доктар філалагічных навук, прафесар, загадчык кафедры беларускай літаратуры.
42. ПАЎЛАВЕЦ Дзмітрый Дзмітрыевіч -- кандыдат філалагічных навук, загадчык кафедры беларускай культуры.
43. СЕМІКОП Арнольд Фёдаравіч -- кандыдат педагагічных навук, прафесар, загадчык кафедры тэорыі і методыкі фізічнай культуры.
44. КАЛЯДА Віктар Антонавіч -- кандыдат педагагічных навук, загадчык кафедры фізвыхавання.
45. ГАВЕЙКА Сяргей Мікалаевіч -- кандыдат эканамічных навук, загадчык кафедры эканамічнай інфарматыкі і АСК.
46. БАБЫНА Уладзімір Піліпавіч -- кандыдат эканамічных навук, загадчык кафедры бухгалтарскага ўліку, кантролю і аналізу гаспадарчай дзейнасці.
47. ХАРЛАМАЎ Іван Фёдаравіч -- доктар педагагічных навук, прафесар, загадчык кафедры педагогікі.
48. КРЫШЧЫК Людміла Уладзіміраўна -- студэнтка IV курса гісторыка-юрыдычнага факультэта.

Вучоным сакратаром Савета назначаны дацэнт **Л.Я.Палякоў.**

Тэрмін паўнамоцтваў новага Савета універсітэта вызначаны на 3 гады.

**АБ НОВЫХ АКЛАДАХ**

# НЕРАЎНАЗНАЧНАЯ ВЕРТЫКАЛЬ

Вынесенае ў загаловак слова "вертыкаль" за апошні час набыло значна шырэйшы сэнс. І гэта датычыцца не толькі выканаўчай улады. Вельмі хутка ўздымаюцца па вертыкалі цэны на прадукты, прамысловыя тавары, усе віды паслуг. У апошні час асабліва адчувальна пачала адбівацца на сямейных бюджэтах аплата жылля, спажываемай электраэнергіі ды і шмат чаго іншага.

У каго і былі якія-небудзь зберажэнні на ашчадкніжках, дык іх амаль поўнасцю праглынула дэнамінацыя. А вось цэн яна як быццам і не дакранулася. Застаюцца ўсё тыя ж шматзначныя лічбы. Зойдзеш у магазін, паглядзіш на іх, і ўсякі настрой прападае. Як тут не прыгадаць колішні жарт: за капейку -- сто галоў кількі. Цяпер жа за мінімальную зарплату купіш яе лічаныя кілаграмы. Што ж датычыцца далікатэсаў, дык і гаварыць не хочацца. І такое

(Заканчэнне на 5-й стар.)

# З II-га Рэспубліканскага з'езда прафесіянальнага саюза работнікаў адукацыі і навукі

## КАБ ВЫЖЫЦЬ І ПРАЦАВАЦЬ

5-га красавіка ў зале пасяджэнняў Федэрацыі прафсаюзаў Рэспублікі Беларусь праходзіў II з'езд прафсаюза работнікаў адукацыі і навукі. Ад нашага універсітэта яго дэлегатамі былі старшыня прафкома выкладчыкаў і супрацоўнікаў Г.І.Варатніцкі, старшыня прафкома студэнтаў Н.І.Колтышава, студэнты Аганэс Айвазбалян з філалагічнага і Святлана Біран з геолага-геаграфічнага факультэтаў.

Уступным словам з'езд адкрыў старшыня Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі У.І.Ганчарык.

Са справаздачай аб рабоце Рэспубліканскага камітэта галіновага прафсаюза выступіла яго старшыня Т.І.Чобатава. Справаздачу рэўкамісіі зрабіў яе старшыня В.М.Касалапаў.

Як паведаміў нашай рэдакцыі дэлегат Г.І.Варатніцкі, з самага пачатку з'езд праходзіў у бескампрамісная, прынцыповай і патрабавальнай абстаноўцы. Як у справаздачах, так і ў выступленнях, прыняўшых удзел у спрэчках, прыводзіліся шматлікія прыклады, лічбы і факты, якія сведчылі аб тым, што пры такіх умовах, якія склаліся за апошнія гады, працаваць і жыць становіцца амаль немагчымым. Так, Т.І.Чобатава ўказала на ўпадак адукацыі і навукі, нашай ідэалогіі і маралі. На адну з важнейшых дзяржаўных галін летась было зрасходавана ўсяго толькі 6,1% бюджэтных сродкаў рэспублікі пры раней абяцаных 10%. З-за нізкай аплаты працы зніжаецца прафесійны ўзровень настаўнікаў. Да таго ж не ўсе школы ў неабходнай колькасці ўкамплектаваны кадрамі. У прыватнасці, цяпер у рэспубліцы налічваецца 570 вакансій выкладчыкаў замежных моў.

Развальваецца і некалі трывалая навука. Яе пакідаюць найбольш таленавітыя маладыя вучоныя, якія ўходзяць у бізнес, дзе большая гарантыя для нармальнага жыцця.

У рэспубліцы цяпер 2000 прафесараў, але і ім не пазайздросціш. Калі ў пасляваенныя гады заробак вучонага з такім званнем у некалькі разоў перавышаў заработную плату кваліфікаванага рабочага, дык цяпер склалася адваротная сітуацыя. Дзесяткі тысяч тых, хто сваёй працай фарміруе будучыню рэспублікі, апынуліся ў самым прамым сэнсе слова не проста за рысай беднасці, а на мяжы фізічнага выжывання. Заработная плата, якая з'яўляецца адзінай крыніцай існавання педагагічных і навуковых работнікаў, у студзені-лютым 1995 года склала ў сярэднім па галіне 250-260 тыс.руб. або 53,3% ад яе ўзроўню працуючых у прамысловасці.

У сітуацыі, калі кожныя 14 месяцаў у свеце адбываецца падваенне інфармацыі, а кожныя паўтара года -- тэхналагічнае змяненне, адсутнасць прыярытэтнасці адукацыі і навукі пагражае ўсяму грамадству незваротнымі стратамі.

Адной з самых вострых праблем працягвае заставацца жыллёвая. У чэргах па шмат гадоў на яго атрыманне і паляпшэнне стаяць многія тысячы педагогаў і нават вучоных.

Пра ўсё набалелае ў поўны голас і з вялікай заклапочанасцю аб будучыні гаварылі не толькі дэлегаты. У сваім выступленні міністр адукацыі і навукі В.І.Стражаў таксама падкрэсліў, што Вярхоўны Савет Беларусі прынятых раней абавязацельстваў у галіне адукацыі не выканаў.

Сапраўдная трывога аб сённяшнім становішчы і будучым лёсе работнікаў адукацыі і навукі прагучала і ў выступленні старшыні Федэрацыі прафсаюзаў У.І.Ганчарыка.

У рабоце з'езда прыняў удзел і выступіў старшыня Міжнароднай асацыяцыі прафсаюзаў адукацыі Р.А.Папілаў.

На з'ездзе з некаторымі змяненнямі і дапаўненнямі да праекта прыняты Статут прафесіянальнага саюза работнікаў адукацыі і навукі. Былі прыняты таксама звароты яго дэлегатаў да органаў дзяржаўнай улады і кіравання, грамадскіх рухаў, грамадзян Беларусі, да ўсіх членаў прафесіянальнага саюза і работнікаў адукацыі. У апошнім з іх запісана: **"Мы заклікаем усіх членаў прафсаюза актыўна ўдзельнічаць у выбарчай кампаніі і падтрымаць на выбарах тых кандыдатаў, якія будуць абараняць нашы сацыяльныя правы і інтарэсы сістэмы адукацыі."**

Выбраны кіруючыя органы Рэспубліканскага камітэта галіновага прафсаюза і дэлегаты на II з'езд Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі. Старшынёй РК аднагалосна абрана Т.І.Чобатава. Членамі Рэспубліканскага камітэта прафсаюзаў ад нашага універсітэта сталі студэнтка Святлана Біран і старшыня прафкома студэнтаў Н.І.Колтышава, якая ўвайшла таксама ў састаў Прэзідыума РК галіновага прафсаюза.

# НА СЕМІНАРЫ-НАРАДЗЕ

Ва ўмовах рынachных адносін як ніколі раней ўзрастае роля стандартызацыі, сертыфікацыі і метралагічнага забеспячэння. З гэтай мэтай Міністэрствам адукацыі і навукі Рэспублікі Беларусь выдадзены загад аб арганізацыі служб па стандартызацыі і метралагічнаму забеспячэнню, правядзенню адзінай тэхнічнай палітыкі.

Нядаўна адбыўся семінар-нарада па стандартызацыі, метралогіі і сертыфікацыі для адказных работнікаў усіх вышэйшых навучальных устаноў рэспублікі. Яго адкрыў начальнік упраў-лення падрыхтоўкі навуковых кадраў і каардынацыі навуковых даследаванняў Мінадукацыі і навукі С.С.Вятохін, які падкрэсліў важнасць бесперапыннай падрыхтоўкі спецыялістаў у названай галіне, стварэння атэставаных цэнтраў /лабараторый/ па сертыфікацыі прадукцыі /створаныя такога профілю цэнтры ў ВНУ Расіі прыносяць 10% навуковага бюджэту/. У іншых дакладах спецыялістаў Белстандарту адзначалася важнасць забеспячэння ў нашай рэспубліцы якасці прадукцыі і павышэння яе канкурэнтаздольнасці, адзінства вымярэнняў. Ад рашэння гэтых пытанняў залежыць якасць абароны спажыўца ў сувязі з патокам на рынак Беларусі харчовых тавараў і не толькі іх.

Вялікая ўвага ўдзялялася стандартызацыі і метралагічнаму забеспячэнню ў сістэме адукацыі. І гэта не выпадкова. Большасць ВНУ рэспублікі перайшлі на новую форму падрыхтоўкі спецыялістаў -- універсітэцкага навучання, а вучэбныя планы ў асноўным засталіся ранейшымі, за выключэннем уніфікацыі дысцыплін гуманітарнага профілю. Прычым з'явіўся шэраг спецыяльнасцей і спецыялізацый вузкага профілю, што ў рыначных умовах з'яўляецца праблематычным. Гэтыя пытанні ўздымаліся ў выступленні аўтара гэтых радкоў і знайшлі падтрымку ўдзельнікаў семінара.

**М.АЛЯШКЕВІЧ,**
**загадчык кафедры фізічнай метралогіі, дацэнт.**



*Імянныя стыпендыяты*

# ВЫБАР АДЗІНЫ І ПРАВІЛЬНЫ



У многіх выпускнікоў школ выбар далейшага жыццёвага шляху бывае не надта доўгім і пакутлівым. Іх прыхільнасць са школьнай парты да гуманітарных або дакладных навук дапамагае вызначыць, якой прафесіі аддаць перавагу. У Вольгі Кабялка было крыху інакш. Закончыла СШ №44 г.Гомеля на "выдатна" і "добра" і задумалася -- што ж далей? Падабалася ёй многае і найбольш за ўсё тое, што звязана са здароўем чалавека. Але традыцыйная медыцына, да якой мы ўсе прывыклі, дзяўчыну не надта цікавіла. Хацелася чагосьці іншага. А ў апошні час асабліва часта сталі гаварыць пра нетрадыцыйныя спосабы лячэння, якія літаральна могуць рабіць з чалавекам цуды, вяртаць яму без лякарстваў і ін'екцый ужо страчаную надзею на выздараўленне. У першую чаргу размова ідзе аб мануальнай тэрапіі, біяэнергетыцы, лячэбнай фізкультуры, масажы. Менавіта такой медыцыне і захацела прысвяціць сябе Вольга. Таму паступіла на факультэт фізічнай культуры ГДУ, дзе рыхтуюць спецыялістаў па лячэбнай фізкультуры і масажу.

Цяпер В.Кабялка вучыцца ўжо на трэцім курсе. Да вучобы ставіцца з сур'ёзнасцю і адказнасцю, у залікоўцы -- выдатныя адзнакі. Яе стараннасць па заслугах і ацэнена: з другога семестра бягучага навучальнага года яна ўдастоена стыпендыі імя Ф.Скарыны. Калі ўлічыць той факт, што на факультэце фізічнай культуры дагэтуль імянных стыпендыятаў не было, то для дзяўчыны гэта і гонар, і вялікая адказнасць. Апраўдваць гэта званне яна стараецца не толькі выдатнай вучобай, але і актыўнай грамадскай дзейнасцю: Вольга -- праформ факультэта. А спраў і клопатаў, як вядома, з гэтай пасадай звязана нямала.

Сваю будучую работу Вольга Кабялка ўяўляе не толькі тэарэтычна. Ёсць у яе і пэўная практыка. Звязана яна з тым, што працуе рэгістратарам і асістэнтам ва ўрача нетрадыцыйнай медыцыны, магістра біяэнергетыкі Валянціны Леанідаўны Казловай, якая запрошана на кафедру ЛФК для работы над комплекснай праграмай па аздараўленню, псіхафізічнай рэабілітацыі людзей, якія пражываюць у чарнобыльскай зоне. Цяпер яна праводзіць лячэнне выкладчыкаў, супрацоўнікаў універсітэта, іх дзяцей з выкарыстаннем практыкаванняў лячэбнай фізкультуры, карэкцыі апорна-рухальнага апарату, апрацоўкі біялагічна актыўных кропак і рэфлекторных зон чалавека. Вользе бачны станоўчыя вынікі, якія атрымліваюцца ў пацыентаў пасля лячэбных сеансаў, што праводзіць В.Л.Казлова. І гэта нямала дае дзяўчыне ў плане яе станаўлення як будучага спецыяліста.

**Т.ДУБЯК.**

**На здымку: Скарынаўская стыпендыятка Вольга Кабялка.**
**Фота У.Чысціка.**

# НЕРАЎНАЗНАЧНАЯ ВЕРТЫКАЛЬ

**(Заканчэнне. Пачатак на 3-й стар.)**

параўнанне можна зрабіць па ўсіх жыццёва важных пазіцыях, якое далёка не на карысць чалавека.

Па вертыкалі ўздымаецца і наша заработная плата. Аднак яна ўсё больш адстае ад цанавой. Яе чарговае павелічэнне адбылося ў мінулым месяцы. Каб задаволіць шматлікія запытанні нашых чытачоў, мы папрасілі ў планава-фінансавым аддзеле універсітэта назваць памеры заробку для найбольш пашыранай катэгорыі работнікаў.

**(з улікам працоўнага стажу па спецыяльнасці: першая лічба -- да 5 гадоў, 2 -- звыш 5-ці, 3 -- звыш 10, 4 -- звыш 15 гадоў)**

-- загадчык кафедры, прафесар, доктар навук: 660450 - 726490 - 759520 - 792540; без вучонай ступені доктара навук: 628950 - 691840 - 723290 - 754740 руб.;

-- прафесар з вучонай ступенню доктара навук: 628950 - 691840 - 723290 - 754740 руб.; без вучонай ступені доктара навук: 598500 - 658350 - 688270 - 718200 руб.;

-- дацэнт з вучонай ступенню: 570150 - 627160 - 655670 - 684180 руб.; без вучонай ступені: 542850 - 597130 - 624280 - 651420 руб.;

-- старшы выкладчык з вучонай ступенню: 542850 - 597130 - 624280 - 651420 руб.; без вучонай ступені: 516600 - 568260 - 594090 - 619920 руб.;

-- асістэнт, выкладчык з вучонай ступенню: 492450 - 541690 - 566320 - 590940 руб.; без вучонай ступені: 469350 - 516280 - 539750 - 563220 руб.;

-- выкладчык-стажор: 443100 - 487410 - 509560 - 531720 руб.

***Заўвага:*** У пасадавых акладах не ўлічаны надбаўкі за выкладанне на беларускай мове.

Пасадавыя аклады спецыялістам, у тым ліку лабарантам з вышэйшай адукацыяй: вядучаму спецыялісту - 443100 руб., І катэгорыі - 417900 руб., ІІ катэгорыі - 393750 руб., без катэгорыі - 371700 руб.; з сярэдняй адукацыяй: спецыялістам І катэгорыі - 330750 руб., ІІ катэгорыі - 311850 руб., без катэгорыі - 278250 руб.

Пасадавыя аклады работнікаў ІВЦ: начальніка сектара - 469350 руб., спецыялістам І катэгорыі - 443100 руб., ІІ катэгорыі - 417900 руб., без катэгорыі - 393750 руб.

Пасадавыя аклады работнікаў бібліятэкі з вышэйшай адукацыяй /без уліку стажа работы па спецыяльнасці/: І катэгорыі - 393750 руб., ІІ катэгорыі - 371700 руб., без катэгорыі - 350700 руб.

Аклад сакратара-машыністкі - 248850 руб., дворніка - 130510 руб., прыбіральшчыцы - 115500 руб.

# З ЖЫЦЦЯ ПАДРЫХТОЎЧАГА АДДЗЯЛЕННЯ

## ТВОРЧЫЯ ЭКСПРОМТЫ БУДУЧЫХ ФІЛОЛАГАЎ

Як толькі не даводзіцца нашым студэнтам "самавыяўляцца": ад гандлю на базары да закліку аб ўз'яднанні Беларусі і Егіпта! Слухачы нашага падрыхтоўчага аддзялення яшчэ не студэнты /курыца не птушка – прапаршчык не афіцэр!/, але спадзяюцца трапіць у гэта шчаслівае, бесклапотнае, дружнае брацтва.

Верагодна, ідэальных слухачоў /як і студэнтаў/ не бывае, але трэба справядліва адзначыць, што нашы слухачы-філолагі яшчэ не навучыліся "сачкаваць" з заняткаў. Затое паспелі паспрабаваць свае сілы ў вершапісанні і здзівіцца сваім поспехам.

Вывучэнне раздзела "Тэорыя літаратуры" заканчваецца тэмай "Вершаскладанне". Мы навучыліся вызначаць віды стоп вершаваных размераў, рыфмаў і г.д. І вось, калі да канца апошніх заняткаў па названай тэме заставалася 15 хвілін, мы вырашылі "пагуляць" у рыфмы. Агульнымі намаганнямі склалі пяць рыфм і прыступілі да справы. Для ўсіх гэта была спроба пяра. Агульны настрой аўдыторыі і лексічнае напаўненне задання не настройвалі на сур'ёзны лад і таму шэдэўраў лірыкі з грамадзянска-філасофскім пафасам не атрымалася. Затое ў вялікай аўдыторыі гучаў дружны смех рабят над сваімі паэтычнымі намаганнямі. Ды і як было не павесяліцца ад аднаго толькі спалучэння рыфмаў: стол – столб; печка – свечка; свет – паэт і інш.

Трэба сказаць, што такое заданне спадабалася слухачам, і для дамашняй работы над названай тэмай мы склалі яшчэ 14 пар рыфмаў, ускладніўшы пры гэтым заданне: неабходна было напісаць 2-3 вершы, выкарыстаўшы такія віды строф, як санет, актава, або звязны тэкст з 3-4 чатырохрадкоўяў на ўсе віды рыфмоўкі.

Тут ужо адчуваецца сур'ёзны роздум над праблемамі жыцця: гэта і каханне /чамусьці неподзеленае, падманутае/, і ўяўленні аб сямейным жыцці /таксама чамусьці няўдалым/, і палітыка /якая ўсім ужо надта надакучыла/.

Так, даследаванне настрою нашых слухачоў на момант творчай работы паказвае, што ў светаадчуванні рабят пераважаюць сумныя ноткі, матывы дыскамфорту, сацыяльна-духоўнага разладу. Такія, напрыклад, работы Наталлі Валошынай /"Опять, словно мерзкая муха// Кружится осенняя скука ..."/, Алены Пухавай /"Вся наша жизнь – одно терзание/, /Лишь грустное воспоминание..."/.

Цікавы вянок з пяці санетаў спляла Наталля Каліно. У вясёлай, арыгінальнай, гумарыстычнай форме яна апісала свае пакутлівыя пошукі сюжэта для паэмы "Мука". Заканчваецца чарніла ў ручцы пачынаючага паэта, але галава поўная ўспамінаў: "Ах! Извините! Чернил должна налить//... //Порою лучше я в воспоминаньях". А далей тры санетныя формы зліваюцца ў адно вялікае паэтычнае апавяданне, прасякнутае млосцю пяшчотных успамінаў аб каханні. Прыемна здзіўляюць разважанні аб сэнсе жыцця, выбары жыццёвых прыярытэтаў:

*Сейчас должны мы выбирать:*
*Иль нам любовь дарить,..*
*Иль бремя тяжкое нести.*

І зусім ужо маральна-філасофскі канец верша ў духу сентэнцыйнай паэзіі Амара Хаяма:

*... Ты вспомни матери наказ:*
*Не верить подлецам, лгунам,*
*Ведь правда их -- один обман.*

Заканчвае свой верш Н.Каліно аптымістычна: "...Посмотри вокруг: всё дышит,// Всё живёт, и ты живи, мой друг!".

Цікавую работу прадставіла Аксана Гарашчук. Яе верш мы ўмоўна назвалі "Супружеские страдания". У чаканні вернага мужа лірычная гераіня паэтэсы пакутуе ў здагадках: дзе мог затрымацца карміцелец сям'і?

*...наверно, это в радость*
*Разделить с другою младость,*

Але віной усяму аказваецца не саперніца, а дождж:

*"...я так промок", --*
*Сказал, переступив порог.*

І далей:

*Тускнеет зло и, как туман,*
*Обид исчезнет океан*
*И между нами вновь и вновь*
*Пылает нежная любовь.*

Атрымаліся ў нас вершы і гумарыстычнага характару. Так, працягваючы тэму "промокшего супруга", лірычная гераіня Наталлі Коцур прызнаецца:

*... Мне приснилось, будто в морге я.*
*Будто там стихи пишу,*
*Рассуждаю о политике...*
*Этим мертвецов смешу:*
*"В наш мир пожить сейчас подите-ка!.."*

Вось такія прыклады з разраду "чорнага гумару".

Праявіўся яркі талент гумарыста і ў Вольгі Рогаўцавай, якая напісала страшылку-сентэнцыю "П'янству - бой!".

Закончыць агляд вынікаў творчай работы слухачоў па тэме вершаскладання хочацца забаўляльнай "Чукотской песней". Чаму чукоцкай, калі аб Чукотцы ў ёй няма ні слова? Таму, што вельмі ўжо характэрная фраза гучыць у канцы верша Алены Пухавай:"... Што вижу, слышу, то пишу,// И вас, наверно, рассмешу".

Такім чынам, мы прадставілі на твой суд, патрабавальны чытач-інтэлектуал, нашы першыя крокі ў паэзіі. Але перш, чым судзіць строга, успомні: гэта ўсяго толькі сціплыя творчыя экспромты на зададзеныя рыфмы. Але якія яны эмацыянальныя і цікавыя... Гэтым мы проста хацелі даказаць, што чалавеку ўсё пад сілу, усё даступна, што ў кожнага ёсць скрыты або нерастрачаны патэнцыял.



# "У ДУШЫ КОЖНАГА ЧАЛАВЕКА ЁСЦЬ КЛАПАН, ЯКІ АДКРЫВАЕЦЦА ТОЛЬКІ ПАЭЗІЯЙ"

Перакананa, што задача выкладчыка -- не толькі даць неабходны аб'ём ведаў у вузкіх рамках праграмы, за адзін навучальны год не толькі падрыхтаваць слухачоў да паступлення ва універсітэт, але і пашырыць іх кругагляд, зацікавіць, узбудзіць у іх творчыя жаданні.

Вывучэнне паэзіі "серебряного века" выклікала цікавасць слухачоў багаццем імёнаў, разнастайнасцю тэматыкі, незвычайнасцю паэтыкі. Таму ўзнікла неабходнасць больш глыбока пазнаёміць іх з мастацтвам дадзенага перыяду.

Складана расказаць аб паэзіі "серебряного века", не закранаючы яе цеснай сувязі з іншымі відамі мастацтва: жывапісам, музыкай. Гэта быў час яркага, хаця і не працяглага, усплёску лірыкі філасофскага, інтымнага, светапоглядавага характару; гэта быў час новых літаратурных цячэнняў: "Мадэрнізм, дэкаданс, абсурд узнікаюць кожны раз, калі дысгармонія свету становіцца нясцерпнай", -- пісаў І.Гарын. Ніколі яшчэ ў мастацтве не было такога патоку горычы, надзей, якія не спраўдзіліся; праблема "сэнсастраты", "страчанага пакалення" паўстала ва ўвесь рост. Ламалася не толькі рэальнае жыццё, але і светаўспрыняцце, псіхіка людзей. Таму творчасць многіх паэтаў, мастакоў, кампазітараў пачатку XX стагоддзя вызначаецца сваімі асацыятыўнымі сувязямі не з рэальным жыццём, а з "патокам свядомасці" /А.Скрабін, М.Рэрых, С.Рахманінаў, М.Врубель/, са светам сноў і галюцынацый /напрыклад, у жывапісу С.Далі/.

Сімвалісты з нейкай дэманічнай самазаглыбленасцю аддаваліся пошукам у сваім унутраным свеце ірацыянальна-магічнай сілы паэтычнага слова /напрыклад, у творчасці В.Хлебнікава/.

У пачатку стагоддзя ў грамадска-літаратурным жыцці Расіі наспеў эстэтычны бунт, і сімвалістаў "пацяснілі" акмеісты і футурусты. Але "Нішто не праходзіць так хутка, як навізна" /Поль Валеры/, і авангардысцкія цячэнні, якія здзівілі публіку сваёй навізной, уступілі месца або рэалізму /у Расіі, у асноўным/, або сюррэалізму /у заходне-еўрапейскім мастацтве/, а пазней -- эстэтыцы абсурду.

Цяпер мы перажываем цяжкія часы. Гэтак жа, як і на рубяжы стагоддзяў, адбываецца інтэлектуальны разброд, паўсюдна -- няўпэўненасць у заўтрашнім дні, страта маральных арыенціраў, усё тая ж "сэнсастрата".

Вось чаму і прыйшла аднойчы думка аб свяце -- свяце паэзіі канца XIX -- пач. XX ст.ст. Чаму менавіта рубеж стагоддзяў? Ды таму, напэўна, што "клин клином вышибают". Светаадчуванне мадэрністаў адпавядае нашаму нялёгкаму часу страты цвёрдай глебы пад нагамі, няўпэўненасці ў заўтрашнім дні. Важна зразумець, што ўсё ў свеце мінае, і таму трэба ўмець процістаяць любым цяжкасцям. Але чалавеку, у якога мінорны настрой, псіхатэрапеўты не рэкамендуюць слухаць мажорную музыку, таму што яна яшчэ больш узмацняе агрэсіўны стан. Ю.Сямёнаў лічыць, што "абавязак літаратуры -- ... духоўна ўзбагачаць чалавека і інфармаваць".

Мая прапанова слухачам аб наладжванні свята паэзіі не была сустрэта з энтузіязмам. Давялося пераканаўча "паднацiснуць". І пачалася падрыхтоўка.

Лепшыя вершы, напісаныя дагэтуль слухачамі, занялі сваё месца на вялікім плакаце, які падрыхтавала Н.Валошына. За тыдзень да свята ўсе атрымалі заданне намаляваць "уражанні" ад аднаго з мадэрнісцкіх вершаў. Малюнкаў аказалася шмат; усе яны вельмі маляўнічыя ў вобразным выражэнні, цікавыя, характарныя. Яны пераўтварылі адну са сцен аўдыторыі ў карцінную галерэю. З вялікім энтузіязмам працавалі Н.Каліно, І.Баранцава, Т.Казлоўская і Н.Валошына над 5-цю калажамі, прысвечанымі мастацтву паэтаў "серебряного века" /ілюстрацыйны матэрыял для іх збірала ўся група/. Работа над калажамі, вершы, малюнкі дапамаглі слухачам глыбей зразумець паэзію сімвалістаў.

Свята працягвалася чатыры акадэмічныя гадзіны. Былі выкарыстаны відэаматэрыялы і слайды па выяўленчаму мастацтву мастакоў-імпрэсіяністаў і сюррэалістаў /Рэнуар, Сіслей, Гаген, Пікасо, Далі і інш./. Цікавымі і пазнавальнымі былі рэфераты, падрыхтаваныя І.Баранцавай, Ю.Лебедзевым, Н.Валошынай, В.Шараевай, А.Пухавай, Т.Дашук. Так была прасочана сувязь літаратуры і жывапісу ў мастацтве пачатку XX ст.

На занятках была выкарыстана музыка кампазітараў-імпрэсіяністаў. Так мы мелі магчымасць атрымаць асалоду ад цудоўных музычных асацыяцый.

Свята працягвалася прадстаўленнем калажаў і ... кулінарнага мастацтва нашых слухачоў. Так мы пастараліся парадаваць не толькі вочы і вушы свае і нашых гасцей, але і паласавацца смачным пячэннем, тартамі, спечанымі самімі слухачамі, а таксама гарачым чаем з самавара.

У падрыхтоўцы да свята прынялі актыўны ўдзел літаральна ўсе слухачы-філолагі падрыхтоўчага аддзялення. А відэаматэрыялы прадставіла культуролаг, выкладчыца тэорыі і гісторыі культуры Гомельскага кааператыўнага інстытута С.Л.Сямёнава.

Наша свята атрымалася. Усё гэта сведчыць аб скрытых у кожным з нас незапатрабаваных рэзервах: трэба толькі разбудзіць таленты. Найбольшае ўздзеянне на псіхіку чалавека аказвае менавіта мастацтва, і вельмі важна пры гэтым, каб яно выклікала ў душах і розумах людзей станоўчы эмацыянальны водгук. І тады знойдзецца месца словам Ф.М.Дастаеўскага: "Прыгажосць выратуе свет!"

**/Матэрыялы падрыхтавала асістэнт кафедры псіхалогіі і падрыхтоўкі да вучобы ў ВНУ Т.АЎДОНІНА/.**

Спорт

## БРОНЗА Ў НАШАГА СТУДЭНТА

У Мінску прайшоў XXYI Міжнародны турнір па вольнай барацьбе на прызы трохразовага алімпійскага чэмпіёна Аляксандра Мядзведзя.

Студэнт факультэта фізічнай культуры Сяргей Дземчанка, які выступаў у вагавай катэгорыі да 68 кг, заваяваў бронзавую ўзнагароду. Гэта -- высокае дасягненне нашага асілка з улікам таго, што ў турніры прымалі ўдзел спартсмены больш 20 краін, і гэты турнір уваходзіць у серыю "Гран-пры".

## БАСКЕТБАЛІСТЫ -- ЧАЦВЁРТЫЯ

У Гомелі прайшоў перадапошні тур чэмпіянату Беларусі па баскетболу сярод мужчынскіх каманд.

Баскетбалісты гомельскага "Сожа", за каманду якой гуляе палова нашых студэнтаў, перайгралі каманду "Аўтамабіліст" з Мінска -- 89 : 86 і ўступілі РТІ з Мінска і "Гродна-93".

Незалежна ад вынікаў апошняга туру месцы ў чэмпіянаце размеркаваліся наступным чынам: РТІ, "Гродна-93", "Аўтамабіліст" і "Сож".

Да гэтага дадам, што ў каманды, якую трэніруе дацэнт кафедры тэарэтычных асноў фізічнага выхавання, заслужаны трэнер Рэспублікі Беларусь, суддзя міжнароднай катэгорыі Барыс Андрэевіч Царыкаў, мноства праблем: няма грошай, спартыўнай формы, ёсць і рад іншых складанасцей.

Хочацца спадзявацца на больш паспяховае выступленне каманды "Сож" у наступным сезоне.

**В.МАРЧАНКА.**



НА ПЕРШАЙ ВЯСНОВАЙ ТРЭНІРОЎЦЫ. Фота У.Чысціка.

**ГОМЕЛЬСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ УНІВЕРСІТЭТ імя Ф.СКАРЫНЫ**

аб'яўляе конкурс на замяшчэнне вакантных пасад па кафедрах:
-- эканомікі і сацыялогіі працы -- дацэнта;
-- аўтаматызаваных сістэм апрацоўкі інфармацыі -- дацэнта, асістэнта;
-- беларускай мовы -- ст. выкладчыка;
-- беларускай літаратуры -- ст. выкладчыка;
-- эканомікі і кіравання вытворчасцю - дацэнта;
-- бухгалтарскага ўліку, кантролю і аналізу гаспадарчай дзейнасці -- ст. выкладчыка /2/;
-- заалогіі і аховы прыроды -- асістэнта;
-- геаграфіі -- асістэнта;
-- філасофіі -- ст. выкладчыка.

Тэрмін падачы заяў -- не пазней 1 месяца з дня апублікавання паведамлення.

Заявы накіроўваць на адрас: 246699 г.Гомель, вул. Савецкая, 104.

**РЭКТАРАТ.**

## ЖАРКОЎ ДЗМІТРЫЙ МІРОНАВІЧ



3-га красавіка пасля цяжкай хваробы перастала біцца сэрца дырэктара спартыўнага клуба універсітэта Дзмітрыя Міронавіча ЖАРКОВА. Не стала чалавека, уся працоўная дзейнасць якога была звязана з нашай ВНУ.

Д.М.Жаркоў нарадзіўся 2 мая 1936 г. у в.Янова Веткаўскага раёна ў сялянскай сям'і. Яго бацька загінуў на фронце.

З-за цяжкага матэрыяльнага становішча вучоба Дзмітрыя ў школе праходзіла з некаторым перарывам. Стаўбунскую СШ закончыў толькі ў 1956г. Восенню таго ж года быў прызваны на службу ў ВМФ, якую праходзіў на караблях Паўночнага флоту. Пасля звальнення ў запас у 1960 г. паступіў вучыцца на факультэт фізічнага выхавання Гомельскага дзяржаўнага педагагічнага інстытута імя В.П.Чкалава, які закончыў у 1964 г. У студэнцкія гады Дзмітрый Міронавіч зарэкамендаваў сябе добрым спартсменам, быў адным з самых актыўных удзельнікаў танцавальнага ансамбля.

Атрымаўшы вышэйшую адукацыю, Д.М.Жаркоў пачаў працаваць выкладчыкам кафедры тэорыі і методыкі фізвыхавання Гомельскага педінстытута, а з 1 мая 1969 г. быў пераведзены ў штат заснаванага дзяржуніверсітэта. Шмат гадоў ён працаваў старшым выкладчыкам кафедр факультэта фізічнага выхавання і дырэктарам ДЮСШ пры СК ГДУ, а з 1 мая 1991 г. узначальваў спартыўны клуб універсітэта.

У снежні мінулага года Дзяржаўны камітэт Рэспублікі Беларусь па фізічнай культуры і спорту за шматгадовую плённую дзейнасць у спартыўных арганізацыях, якая садзейнічала дасягненню высокіх паказчыкаў у развіцці фізічнай культуры і спорту, прысвоіў Д.М.Жаркову ганаровае званне "Заслужаны трэнер Рэспублікі Беларусь".

Светлая памяць аб Дзмітрыю Міронавічу Жаркове надоўга захаваецца ў нашых сэрцах.

**ГРУПА ТАВАРЫШАЎ.**

Рэктарат, грамадскія арганізацыі, выкладчыкі, супрацоўнікі і студэнты універсітэта глыбока смуткуюць з выпадку смерці дырэктара спартклуба **ЖАРКОВА** Дзмітрыя Міронавіча і выказваюць сваё спачуванне яго родным і блізкім.

Калектыў АГЧ смуткуе з выпадку заўчаснай смерці электрыка **ПІЧУГІНА** Валянціна Захаравіча і выказвае спачуванне яго сям'і.

Аўтары надрукаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць прыведзеных фактаў, цытат, эканамічных даных, асабістых імён, геаграфічных назваў і іншай інфармацыі, а таксама за тое, каб у матэрыялах не ўтрымлівалася даных, якія не падлягаюць адкрытый публікацыі. Рэдакцыя можа друкаваць артыкулы ў парадку абмеркавання, не раздзяляючы пункту гледжання аўтара.

ЗАСНАВАЛЬНІК -- Гомельскі дзяржаўны універсітэт імя Ф.Скарыны.

Наш адрас: 246699, г. Гомель, вул. Савецкая, 104, пакой 1-18, тэл. 57-43-21.
Рэгістрацыйны № 221

Спонсары газеты -- НВП "Сучасныя тэхналогіі", прафком студэнтаў.

Газета набрана і зверстана на настольна-выдавецкім комплексе ІВЦ ГДУ, адрукавана на Гомельскай фабрыцы "Палесдрук", г.Гомель, вул.Савецкая, 1.

Рэдактар
Ул.П. БАЛОГА

Аб'ём 1 друк. арк.
Тыраж 1.500 экз.
Заказ 205
Падпісана да друку 13.04.95.